# АБ ДАПАМОЗЕ ЗГУРТАВАННЮ БЕЛАРУСКІХ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ЛІТВЕ, КУЛЬТУРНЫМ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ ПАМІЖ РЭСПУБЛІКАЙ БЕЛАРУСЬ І ЛІТОЎСКАЙ РЭСПУБЛІКАЙ

Згодна з планам мерапрыемстваў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па рэалізацыі дамоўленасцей, дасягнутых у ходзе візіта Урадавай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь у Літоўскую Рэспубліку 30 верасня 1999 г., у Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь адбылася сустрэча дэлегацыі Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве, якое было ўтворана 10 студзеня 1997 г., з міністрам культуры А.Сасноўскім.

У сустрэчы прынялі ўдзел з боку міністэрства намеснік міністра В.Гедройц, начальнік аддзела ўстаноў культуры і народнай творчасці Т.Стружэцкі, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур У.Мантвідас, вядучы супрацоўнік аддзела ўстаноў культуры і народнай творчасці А.Бабіцкі, з боку беларускай дыяспары ў Літве — прэзідэнт Згуртавання беларускіх грамадскіх аб'яднанняў у Літве Л.Мурашка, дырэктар беларускай сярэдняй школы імя Ф.Скарыны ў Вільнюсе Г.Сівалава, віцэ-прэзідэнт Згуртавання, намеснік дырэктара беларускай школы Д.Базар, кіраўнік беларускага клуба «Сябрына» Вільнюса Р.Вайніцкі, каардынатар беларускага культурнага цэнтра «Крок» у г.Вісагінасе А.Давыдзюк, старшыня беларускага культурнага цэнтра г.Шальчынінкай П.Малафей.

У сустрэчы таксама прыняў удзел саветнік па культуры Пасольства Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы У.Скараходаў.

У час сустрэчы міністр культуры А.Сасноўскі адзначыў, што міністэрства, у межах сваіх магчымасцей, аказвае пастаянную дапамогу таварыствам беларускай культуры замежжа, у тым ліку Згуртаванню беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве.

Асноўнымі формамі дапамогі ТБК замежжа з'яўляюцца перадача бібліятэчак беларускай літаратуры, нотна-метадычных зборнікаў, сцэнічных касцюмаў, музычных інструментаў, абсталявання, накіравання прафесійных і самадзейных калектываў, асабістых выканаўцаў, спецыялістаў-кансультантаў, народных майстроў на святы беларускай культуры, фестывалі беларускай песні, рэгіянальныя сустрэчы беларусаў.

У адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай «Беларусы ў свеце» для ўдзелу ў II фестывалі беларускай песні «Вісагінас-97», які адбыўся 13 верасня 1997 г., былі накіраваны фальклорны ансамбль народнай музыкі «Паазер'е» Пастаўскай дзіцячай музычнай школы і харэаграфічны ансамбль Беларускага універсітэта культуры, ад імя Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь беларускаму культурнаму цэнтру ў г.Вісагінасе былі перададзены акардыён «Ільмера», відэа- і аўдыёкасеты, нотна-метадычная літаратура.

У 1998 г. у святах і днях беларускай культуры прынялі ўдзел у г.Шальчынінкае фальклорны ансамбль танца «Вязынка», у г.Вільнюсе — народны ансамбль «Юнацтва» (г.Баранавічы). З 18 па 22 сакавіка 1999 г. у гарадах Вільнюсе і Шальчынінкае з поспехам прайшлі канцэрты Дзяржаўнага акадэмічнага хора Рэспублікі Беларусь імя Г.Цітовіча, Дзяр-

жаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь і інш.

Па запрашэнню Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур разам з гуртамі «Дзянніца» і «Мінскі гармонік» было праведзена пад Вільнюсам беларускае абрадавае свята «Купалле».

Пашыты і перададзены беларускія сцэнічныя касцюмы дзіцячаму калектыву «Спадчына» (г.Друскінінкай), фальклорнаму калектыву Беларускага культурнага цэнтра Шальчынінкайскага раёна.

Па выніках работы ў 1998 г. быў прадстаўлены на ўзнагароджанне спецыяльнай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За захаванне народных культурных традыцый» старшыня Беларускага культурнага цэнтра Шальчынінкайскага раёна П.М.Малафей.

У час восеньскіх канікулаў у 1998 г. для дзяцей беларусаў г.Вісагінаса Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур была арганізавана экскурсія па г.Мінску з наведваннем Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача.

У заключных мерапрыемствах II Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур 22—24 мая 1998 г. у г.Гродна прыняла ўдзел капэла народнай музыкі «Нямунэліс» г.Друскінінкая.

4 снежня 1998 г. заключана пагадненне аб культурным навуковым супрацоўніцтве паміж Беларускай і Літоўскай акадэміямі музыкі, ёсць дамоўленасць аб заключэнні пагадненняў паміж Беларускай і Літоўскай акадэміямі мастацтваў, Беларускім інстытутам праблем культуры і Літоўскім інстытутам культуры і мастацтва, нацыянальнымі бібліятэкамі і мастацкімі музеямі Беларусі і Літвы. Распрацавана праграма ўдзелу беларускіх і літоўскіх калектываў у прэстыжных фестывалях, конкурсах, аглядах, гастрольнай дзейнасці . У сакавіку 1999 г. у Вільні адбылося выступленне актэта салістаў канцэртнага эстрадна-сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь у зале Акадэміі музыкі Літвы.

У 1998 г. Навагрудак наведалі старшыня камітэта сейма па навуцы, культуры і адукацыі Я.Жыбартас і вядомы паэт П.Паляленіс. У канцы года беларуская дэлегацыя наведала Вільнюс.

Першага лютага 1999 г. споўнілася 90 гадоў былой Віленскай беларускай гімназіі, нашчадкам і прадаўжальнікам якой з'яўляецца Віленская Беларуская школа імя Ф.Скарыны. Па просьбе кіраўніцтва Беларускага клуба «Сябрына» ў

школе будзе ўсталяваны барэльеф Ф.Скарыны (скульптар — У.М.Лятун).

31 сакавіка 1999 г. была падпісана дамова аб супрацоўніцтве паміж саюзамі кінематаграфістаў Беларусі і Літвы.

*А.Бабіцкі, вядучы спецыяліст аддзела ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь*